26.02.2024 / 15:55

«Байпол» выявіў яшчэ аднаго беларуса-вагнераўца ва Украіне. Гэта бомж з сямю судзімасцямі

Гэта Казакоў Аляксандр Канстанцінавіч, 1979 года нараджэння, ураджэнец Слаўгарада ў Магілёўскай вобласці. Ён быў завербаваны на тэрыторыі Расіі, паведамляе «Байпол».



Казакоў з 2010 па 2018 год быў сем разоў асуджаны за маёмасныя злачынствы, у асноўным за крадзяжы прадуктаў.

Так, у 2013 годзе ён прабраўся на склад крамы ў вёсцы Целяшы, адкуль вынес тавараў на 1 743 400 недэнамінаваных рублёў. А ў 2018 годзе ў стане алкагольнага ап'янення нанёс не менш як чатыры ўдары неўстаноўленым прадметам у вобласць галавы брату, прычыніўшы яму лёгкія цялесныя пашкоджанні.

У дзеяннях Казакова былі прыкметы складу злачынства, прадугледжанага арт. 361-3 КК Беларусі, за што прадугледжана пазбаўленне волі на тэрмін ад 2 да 5 гадоў.

Чытайце таксама:

[«Байпол» апублічыў новага свайго супрацоўніка — пракурора, які звольніўся ў 2021 годзе]

[«Ніхто з датычных не знаходзіцца ў Беларусі». У «Белполе» расказалі пра трансляцыю выступу Ціханоўскай на маніторах]

[Брытанская разведка назвала, колькі вагнераўцаў засталося ў Беларусі]

Nashaniva.com

БАЙПОЛ | BYPOL | ПВК «ВАГНЕР»

ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

«Марфа, вы там вялікая знакамітасць, вас вельмі чакаюць!» Экс-палітзняволеная — пра сустрэчы з Рабковай і Бяляцкім

Літва праверыць 18 тысяч беларусаў, якія пасяліся ў краіне да ўведзеных у 2022 годзе абмежаванняў 1

Кіраўнік вядомай у мінулым страхавой фірмы пяты год працуе таксістам у Мінску 3

У Мінску будуць правяраць сістэму тэрабароны